

# МІХАЙЛАЎСКІ ЛІСТОК

САКАВІК, 2019

Свята-Міхайлаўскі прыход г. Мінска, вул. Янкоўскага, 2

# П А Р А С Т А С

Парастасам (з грэцкай – хадайніцтва) называюць адмысловую форму ўсяночнага трывання, прысвечаную малітве за спачылых. Шэраговая паніхіда з'яўляецца скарочанай формай парастаса, што і тлумачыць яе назву (паніхіда з грэцкай – усяночная). Поўны парастас паводле традыцыі здзяйсняецца ў навячэр'е памінальных субот (у Мясапусную, другую, трэцюю і чацвёртую суботу Вялікага Посту, і перад Пяцідзясятніцай). У некаторых храмах цягам года, паводле мясцовых звычаяў, парастас служыцца і ў іншыя дні. Некаторыя храмы прымаюць на сябе абавязак служыць парастас штосуботу акрамя суцэльных сядзьміц, але гэта здараецца рэдка.

Паводле сваёй кампазіцыі парастас – гэта прашэнне да Госпада, якое Царква прыносіць Госпаду ад імя спачылых. Асноўнай адрознай асаблівасцю з'яўляецца тое, што 17-я кафізма Псалтыры (118 псалом у трох "славах") чытаецца не чытальнікам, а святаром з асаблівай урачыстасцю. Асноўныя тэмы гэтага псалма – выказванне веры Богу, шкадаванне аб адступленні ад закона, просьба аб міласці ды спагадзе.

Паводле ўставу ўсе прысутныя разам з хорам паўтараюць рэфрэны «*Збаўца, збаў мяне*» і «*Дабраславёны Ты, Госпадзе*».

У нейкім сэнсе можна сказаць, што згодна з хрысціянскай традыцыяй, у чалавека разумеецца тры нараджэнні. Першае – з'яўленне на свет, другое – хрышчэнне вадой і Духам, а трэцяе – пераход у жыццё вечнае. У песнаспевах парастаса смерць персаніфікуецца як параможаная Хрыстом паслугачка пекла, якая не мае ўлады на тымі, хто супачыў у Хрыстовай веры.

Парастас – гэта магчымасць палегчыць супачылым шлях да вечнага дабра пры дапамозе малітваў "царквы ваяўнічай" – хрысціянаў, што жывуць на зямлі зараз. Згодна з Праваслаўным вучэннем, мы можам палепшыць пасмяротную долю чалавека. Найважнейшым момантам узгадання памерлых з'яўляецца памінанне за літургіяй. Парастас жа з'яўляецца дадатковай малітоўнай нагодай. Святыя повязі любові дазваляюць нам рабіць ад імя супачылых і добрыя справы. З гэтай нагоды падчас парастаса і шэраговай паніхіды асвячаюцца стравы для памінальнай трапезы, якія пазней ахвяруюцца для падтрымання служыцеляў царквы і на міласціну ўбогім.

Такім чынам, парастас – гэта адна з найважнейшых магчымасцей узмоцненай сабornай малітвы, нагода для ўзгадання супачылых продкаў.

---

**З блаславення настаяцеля Свята-Міхайлаўскага прыхода**
**протаіерэя Ігара Галакава**
***Укладальнік: Алесь Спіцын***
**Дата выпуску: 30 сакавіка 2019 г.**